60б

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Работніца і Калгасніца Беларусі

85

№ 1
1934 г.

Пад сцягам Леніна,
пад кіраўніцтвам ВКП(б) —
да бясклясавага соцыя-
лістычнага грамадства!

Вучэнне Леніна ў дзеянні

Дзесяць год прайшло з таго часу, як памёр геніяльны правадыр рабочых і працоўных усяго света, вялікі вучань Маркса-Энгельса—Владзімір Ільіч Ленін. У час пахавання Леніна верны яго паплечнік тав. СТАЛІН даў слова аб тым, што справа Леніна будзе даведзена да пераможнага канца.

Прайшоўшыя 10 год рашучага і ўпартага соцыялістычнага будаўніцтва, 10 год гераічнай барацьбы рабочага класа і працоўнага сялянства пад кіраўніцтвам партыі Леніна, рады якой папоўнілі сотні тысяч лепшых сыноў працоўных, пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Комітэта партыі на чале з лепшым большэвіком-ленінцам тав. Сталіным, сведчаць аб тым, што дадзенае тав. Сталіным слова цвёрда і няўхільна ажыццяўляецца.

Бліскучыя перамогі першай пяцігодкі вывелі Совецкі Саюз у першыя рады індустрыяльных краін света. На базе новай тэхнікі адбылася соцыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі.

Беспаваротная перамога калгаснага лада зрабіла Совецкі Саюз краінай самага буйнага земляробства ў свеце.

Праца ў калгасах, узброеных самымі лепшымі машынамі, становіцца разнавіднасцю індустрыяльнай працы.

Створаныя па прапанове тав. Сталіна палітаддзелы МТС і совгасаў зламалі кулацкі сабатаж і дабіліся вялікіх поспехаў у справе барацьбы за ажыццяўленне лозунга партыі аб тым, каб зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі. Ужо зараз ёсць не мала калгасаў, якія сталі большэвіцкімі і ў якіх калгаснікі сталі жыць культурна і заможна.

Дзякуючы перамогам калгаснага лада, вырашаецца найбольш цяжкая гістарычная задача—**ліквідацыя працлегласці паміж горадам і вёскай.**

Краіна Советаў стала самай магутнай у свеце непераможнай краінай, а ўлада Советаў—самай магутнай і аўтарытэтнай уладай.

Вялічэзныя перамогі пролетарыята і ўсіх працоўных Совецкага Саюза падцвярджаюць правільнасць вучэння Леніна і Сталіна аб пабудове соцыялізма ў аднэй краіне.

Гэтыя перамогі дасягнуты ў самай жорсткай барацьбе з контррэволюцыйным грацкізмам, з правым ухілам, з права-лявацкім блокам, з рознымі апартуністамі і двурушнікамі.

Гэтыя перамогі з'яўляюцца перамогамі выдатнейшага правадыра працоўных, сталёвага ленінца тав. СТАЛІНА—вернага і цвёрдага кіраўніка пераможнай соцыялістычнай рэволюцыі.

Ажыццяўленнем ленінскай нацыянальнай палітыкі з'яўляецца правадзімая партыяй лінія індустрыялізацыі нацыянальных рэспублік і абласцей, шырокае развіццё ў іх культуры нацыянальнай па форме, пролетарскай па зместу.

Яркім прыкладам гэтай палітыкі з'яўляецца БССР, Раней адсталася, непісьменная царская калонія „БССР сустракае 17 з'езд ВКП(б) і 15 гадавіну свайго існавання, як адна з перадавых рэспублік Совецкага Саюза, ператварыўшыся ў індустрыяльна-аграрную краіну, дабіўшыся росквіта (перамогі) беларускай культуры, нацыянальнай па форме, пролетарскай па зместу.

Магутнае развіццё прамысловасці, перавысіўшай тэмпы роста прамысловасці Саюза, будаўніцтва новых фабрык і заводаў (Белдрэс, фабрыка штучнага шоўка, „Большэвік", Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, Гомсельмаш, Крычаўскі цэментны завод, Гомельскі шклозавод, трубаліцейны завод і г. д.), карэнная рэканструкцыя старых, па сутнасці саматужных, прадпрыемстваў (завод імя Варашылова, „Комунар", „Чырвоны металіст" і інш.), развіццё новых галін прамысловасці, якія базуюцца ў асноўным на мясцовай сыравіне, павялічылі ў параўнанні з даваенным перыядам больш чым у дзесяць разоў размеры прамысловай прадукцыі нашых фабрык і заводаў, уносячы значныя якасныя зрухі ў характар і структуру прамысловасці БССР". (*З пастановы аб яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б.*

Рост прамысловасці выклікаў велізарны рост пролетарыята, уцягненне новых дзесяткаў тысяч працоўных беларусоў у прамысловасць. За гады першай пяцігодкі склад беларусоў-рабочых павялічыўся з 21,8 тысяч да 61,4 тысяч і складае 62.4 проц., яўрэяў з 14,3 тысяч да 25,1 тысяч.

За гады рэволюцыі раней мяшчанскія гарады выраслі ў буйныя індустрыяльныя цэнтры (Менск, Гомель, Віцебск і інш.).

На базе індустрыялізацыі праведзена соцыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі, калектывізацыя якой азначала канчатковую перамогу над раздробленымі бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі са сталыпінскай хутарызацыяй.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б, пры дапамозе палітаддзелаў калгасы БССР ператвараюцца ў большэвіцкія і кал аснікі ўпэўнена крочаць да заможнага жыцця.

Гэтыя поспехі індустрыялізацыі БССР, дасягнутыя пры братэрскай дапамозе пролетарыята СССР, „стварылі моцную базу для небывалага яшчэ ў гісторыі былых прыгнечаных народаў роста беларускай совецкай культуры, для перавода дзяржаўнага апарата на родную мову насельніцтва, для ўмацавання беларускай совецкай дзяржаўнасці. Створана сетка беларускіх, яўрэйскіх і другіх школ, якімі ахоплена 96 проц. дзяцей школьнага ўзроста, поўнасцю ліквідавана непісьменнасць, разгорнута на беларускай мове і мовах нацменшасцяй шырокая сетка ВНУ, тэхнікумаў, рабфакаў, школ ФЗН, якія ахапляюць звыш 50 тысяч вучняў, з якіх больш 80 проц. дзеці рабочых і сялян. Дасягнута небывалае развіццё друку, навукі, літаратуры, мастацтва, радыё, выраслі аграмадныя кадры інтэлігенцыі і навуковых работнікаў з сяроддзя рабочых і сялян, створана вялікая сетка навукова-даследчых інстытутаў на чале з БелАН, якія займаюць відная месца ў агульнакультурным будаўніцтве. Навука перастала быць здабыткам „выбраных" і ўсё больш становіцца здабыткам шырокіх мас рабочых і калгаснікаў, з якіх ужо вылучыўся рад маладых вучоных, пісьменнікаў і г. д.".

Гэтых поспехаў БССР дасягнула ў барацьбе за генеральную лінію партыі, супроць ухілаў ад яе, у барацьбе за пролетарскі інтэрнацыяналізм.

„КП(б)Б сакрушыла спробы велікадзяржаўных элементаў зрываць справу большэвіцкай беларусізацыі, адначасова рашуча разграміўшы спробы беларускіх нацдэмаў і іх агентуры ўнутры партыі скарыстаць большэвіцкую беларусізацыю ў мэтах рэстаўрацыі ўлады капіталістаў і памешчыкаў і пры дапамозе самай подлай зброі эксплаататарскіх класаў—распальвання нацыянальнай розні—падрыхтаваць адрыў Беларусі ад СССР, ператварэнне БССР у калонію імперыялізма".

„Поспехі соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР і пераход нашай партыі да палітыкі суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як класа, выкарчоўванне астатніх карэнняў капіталізма выклікалі шалёнае супраціўленне буржуазна-нацыяналістычных элементаў і іх агентуры ўнутры партыі.

„Разгромлены, але недабіты класавы вораг (кулак і яго ідэолагіі—эсэры, нацдэмы), усе антысовецкія элементы і іх агентура ўнутры партыі павялі шаленую барацьбу супроць БССР".

„Для працоўных мас Беларусі адрыў ад Совецкага Саюза азначае зварот пад ярмо памешчыкаў і капіталістаў, ператварэнне Беларусі ў калонію замежнага капітала. Вось чаму VIII пленум ЦК КП(б)Б прыняў пастанову аб тым, што: „велікадзяржаўны рускі шавінізм з'яўляецца галоўнай небяспекай у маштабе ўсяго Совецкага саюза і ўсёй ВКП(б), але гэта ні ў якай меры не супярэчыць таму, што ў даны момант у Беларусі галоўную небяспеку прадстаўляе мясцовы беларускі нацыяналізм, які змыкаецца з імперыялістычнымі інтэрвентамі, неабходна асабліва мець на ўвазе новую тактыку рускіх велікадзяржаўных шавіністаў і беларускіх нацыяналістаў, падтрымліваемых усёй контррэволюцыяй, у тым ліку і трацкістамі, якія на цяперашнім этапе блакуюцца паміж сабой на агульнай пляцформе адрыва БССР ад СССР для аслаблення пазіцый СССР і ўмацавання пазіцый капіталізма".

„Усякі, хто прабуе хоць у малейшай ступені аслабіць, або падарваць сувязь Беларусі з Совецкім Саюзам, хто сее рознь паміж працоўнымі Совецкіх рэспублік, той робіць справу ворага, справу беларускай і рускай контррэволюцыі, той аддае працоўных Беларусі пад ярмо польскіх і іншых памешчыкаў і капіталістаў".

Апошні аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б у сваёй пастанове „Аб выніках і бліжэйшых задачах правядзення ленінскай нацыянальнай палітыкі ў БССР" даў чоткі большэвіцкі аналіз усім нацдэмаўскім і нацухілісцкім арганізацыям і вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы па інтэрнацыянальнаму выхаванню працоўных. Ажыццяўленне гэтых пастаноў яшчэ больш умацоўвае сувязь працоўных БССР з Совецкім Союзам.

У дзесятую гадавіну смерці Леніна неабходна таксама адзначыць, як ажыццяўляюцца заветы Леніна аб уцягненні жанчын у вытворчую працу, аб прыцягненні іх да кіраўніцтва дзяржавай, аб вызваленні жанчын ад клопатаў хатняй гаспадаркі.

Ударніцы Ленінграда ў лісце да тав. Сталіна пішуць: „Многім з нас цяжкім здаваўся шлях, які Ленін і ты, тав. Сталін, указвалі ў Окцябрскія дні. Але зараз працоўныя жанчыны ўсяго света бачаць, што вывелі большэвікі нас на шырокі шлях прасторнага чалавечага жыцця".

„Жыццё кожнай з нас—гэта апавяданне аб тым, што пры Совецкай уладзе не можа быць такога становішча, каб чалавек, які жадае добрасумленна працаваць, не мог знайсці месца ў жыцці".

Разам з Ленінградскімі работніцамі і работніцы БССР могуць сказаць: мы, работніцы, адказваем амаль за палову соцыялістычнай праграмы нашай прамысловасці, бо ў прамысловасці БССР працуе 44,1 проц. жанчын. Пасяховае выкананне промфінплана па швейнай прамысловасці, на фабрыцы „Дзвіна", дзе пераважна працуюць работніцы, гаворыць аб тым, як выросла наша работніца, як яна змагаецца зараз за аўладанне тэхнікай, за паляпшэнне якасці прадукцыі.

Не мала ёсць у нас работніц, якія здалі тэхэкзамен на „вельмі добра" (завод „Большэвік", „Варашылаў" і інш.). Жаночая праца ўкаранілася ва ўсіх галінах, нават і ў металаапрацоўчай, дрэваапрацоўчай прамысловасці, на транспарце. Шмат хто з работніц ідзе перадавікамі на вытворчасці.

Не мала работніц працуе брыгадзірамі, майстрамі, загадчыкамі цэхаў.

Асабліва выросла за апошнія гады жанчына-калгасніца, аб якой тав. Сталін сказаў, „што жанчына ў калгасах вялікая сіла".

Не мала ёсць у нас калгасніц-ударніц і аратых, і конюхаў, і трактарыстак, і трапальшчыц, жней, свінарак і іншых, якія спраўляюцца не горш за мужчын на даручаных ім участках работы. Больш 100 жанчын—старшынь калгасаў БССР паказалі, што жанчыны могуць не дрэнна кіраваць буйнай калектыўнай гаспадаркай.

Аднак, вылучэнне жанчын, як работніц, так і калгасніц, на адказныя работы яшчэ адстае ад удзельнай вагі іх у вытворчасці фабрык, заводаў, калгасаў.

Неабходна тут дабіцца большых поспехаў, як указваюць тэзісы да XVII з'езда, якія патрабуюць больш шырокага прыцягнення работніц да кіруючай работы ў советы, прафсаюзы, кааперацыю.

Актывізацыі жанчын садзейнічала разгортванне сеткі бытавых устаноў—сталовых, ясляў, пляцовак, пральняў. Партыя і ўрад вельмі клапоцяцца аб работніцы і калгасніцы, аб палепшанні яе бытавых умоў, аб яе культурным росце.

Гэта яшчэ больш абавязвае работніц і калгасніц змагацца за ажыццяўленне вызначанага партыяй і ўрадам плана вялікіх работ.

Берагчы калгасны лад, як сваё вока. Дабіцца поўнага выканання абавязкаў перад дзяржавай, добраякасна падрыхтавацца да вясны. Змагацца за аўладанне тэхнікай, за палепшанне якасці работы, умацоўваць абароназдольнасць СССР.

Пабольш вучыцца і вучыцца. Будаваць культурнае радаснае жыццё. Далучыцца да абяцання старых Ленінградскіх работніц тав. Сталіну.

„Мы абяцаем табе, тав. Сталін, працаваць зараз, як ніколі. Працаваць так, каб маладая работніца бачыла перад сабой сапраўдны прыклад ударніцтва. Будзем працаваць добра. Ты будзеш задаволен намі, таварыш Сталін".

Так з усёй масай працоўных, цесна згуртаваных вакол партыі ЛЕНІНА, партыя, кіруемая геніальным правадыром працоўных усяго света, верным ленінцам, т. СТАЛІНЫМ будзе і ў далейшым пераможна ажыццяўляць баявое вучэнне сусветнага пролетарыята—марксізм-ленінізм.

„Усямерна ўмацоўваючы інтэрнацыянальнае адзінства працоўных усіх нацыянальнасцяй, КП(б)Б пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК ВКП(б) на чале з тав. СТАЛІНЫМ будзе ў далейшым весці рашучую барацьбу за генеральную лінію партыі, за большэвіцкае правядзенне ленінскай нацыянальнай палітыкі, за новыя перамогі соцыялізма".

„БССР была, ёсць і будзе неадлучнай частнай вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, яго баявым фарпостам на стыку з капіталістычным Захадам".

(*З пастановы пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б*).

Разгорнутая праграма новых перамог

З вялізарным уздымам і энтузіязмам сустрэлі рабочыя, работніцы, калгаснікі, калгасніцы і ўсе працоўныя вялікага Совецкага саюза тэзісы дакладаў на XVII з'ездзе ВКП(б) т.т. Молатава і Куйбышава аб другім пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі СССР і даклада тав. Кагановіча па арганізацыйных пытаннях. Распрацоўка тэзісаў выклікала новую хвалю соцспаборніцтва і ўдарніцтва, арганізацыю новых ударных брыгад імя XVII з'езда.

Работніцы і калгасніцы БССР па закліку перадавых рабочых Масквы актыўна ўключаюцца ў вытворчы паход імя XVII з'езда. У апошніх нумарох нашага журнала надрукаваны матар'ялы, у якіх паказана, як работніцы фабрык „Окцябр", абутковай (Менск), работнікі ясляў, калгасніцы Наталаўскага польскага сельсовета, Клічаўскага раёна, калгасніцы Чачэрскага раёна, сустракаюць з'езды партыі датэрміновым выкананнем плана, павышэннем якасці прадукцыі, барацьбой за аўладанне тэхнікай, за ліквідацыю прарываў па ільну, за добраякасную падрыхтоўку да веснавой сяўбы, лепшы догляд жывёлы, за аўладанне агразоатэхнікай, актыўнасцю ў вучобе, паходам за культурнае жыццё, за палепшанне работы дзіцячых устаноў і г. д.

Энтузіязм працоўных выклікан тэй новай грандыёзнай праграмай соцыялістычнага будаўніцтва, якая разгорнута ў тэзісах.

План развіцця народнай гаспадаркі ў 2-й пяцігодцы павінен забяспечыць: „Ліквідацыю капіталістычных элементаў і класаў наогул, канчатковую ліквідацыю, на грунце поўнага завяршэння калектывізацыі сялянскіх гаспадарак і кааперавання ўсіх саматужнікаў, прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці; ліквідацыю многаўкладнасці эканомікі Совецкага Саюза і ўстанаўленне соцыялістычнага спосаба вытворчасці, як адзінага спосаба вытворчасці, з ператварэннем усяго працоўнага насельніцтва краіны ў актыўных і свядомых будаўнікоў соцыялістычнага грамадства".

Аб размаху соцыялістычнага будаўніцтва ў другой пяцігодцы сведчаць лічбы. Прадукцыя прамысловасці будзе павялічана да канца другой пяцігодкі ў 2,4 разы, а ў параўнанні з даваенным узроўнем—у 9 раз. На новае капітальнае будаўніцтва ў другую пяцігодку вызначана 133,4 млрд. руб. супроць 50,5 млрд. руб., якія затрачаны на будаўніцтва ў першую пяцігодку, што дае павялічэнне ў два з паловай разы.

На вытворчасць сродкаў вытворчасці вызначана сума, якая дае павышэнне супроць затрат у першай пяцігодцы ў два з паловай разы, а на сродкі спажывання ў 4,6 разы, на капітальныя работы на транспарце ў 3 разы.

Асаблівасць плана другой пяцігодкі ў тым, што тэмпы вытворчасці тавараў шырокага спажывання вышэй за тэмпы вытворчасці сродкаў вытворчасці.

Штогодні прырост тавараў шырокага спажывання вызначаецца ў 21,9 проц. (супроць 17 проц. у першай пяцігодцы), а штогодні прырост вытворчасці сродкаў вытворчасці ў 15,9 проц.

Вялікую ролю ў развіцці лёгкай прамысловасці адыграе мясцовая прамысловасць, якая павінна павялічыць выпуск тавараў шырокага спажывання ў тры разы.

У другой пяцігодцы будзе праведзена тэхнічнае пераўзбраенне ўсіх галін народнай гаспадаркі СССР, што забяспечаць укараненне ў найкарацейшы тэрмін навейшых тэхнічных дасягненняў.

Перабудовай машына-будаўніцтва павінна быць забяспечана задавальненне ўласнымі сіламі ўсіх патрэб народнай гаспадаркі ў тэхнічна-перадавым абсталяванні.

У асноўным будзе закончана механізацыя ўсіх працаёмкіх і цяжкіх працэсаў у прамысловасці, па здабычы каменага вугалю, па чорнай металургіі, па торфапрамысловасці, лесазагатоўках. Будзе створана новая энергетычная база для завяршэння ў асноўным электрафікацыі прамысловасці, шырокім развіццём электрафікацыі транспарта і паступовым укараненнем электраэнергіі ў вытворчыя працэсы сельскай гаспадаркі.

Гэтыя грандыёзнейшыя задачы могуць быць ажыццяўлены толькі пры ўмове барацьбы за аўладанне новай тэхнікай і новымі галінамі вытворчасці, толькі пры ўмове, калі „пафас новага будаўніцтва" будзе дапоўнен „пафосам аўладання новых заводаў і новай тэхнікі, сур'ёзным узняццем прадукцыйнасці працы, сур'ёзным скарачэннем сабекошта" *(Сталін)*.

Прадукцыйнасць працы павінна быць павышана за другое пяцігоддзе на 63 проц., замест 41 проц. у першай пяцігодцы, сабекошт павінен быць зніжан на 26 проц., што дасць 14 млрд. руб. эканоміі прамысловасці ў канцы другой пяцігодцы.

Вялізарнейшая ўвага ў другой пяцігодцы аддаецца барацьбе за паляпшэнне якасці і асартымента прадукцыі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Па сельскай гаспадарцы вызначана ўдваенне прадукцыі ў другой пяцігодцы, што можа быць дасягнута толькі на грунце поўнага завяршэння калектывізацыі і ажыццяўлення тэхнічнай перабудовы ўсёй сельскай гаспадаркі.

У 1937 годзе машына-трактарнымі станцыямі павінны быць ахоплены ўсе калгасы.

Механізацыя сельскай гаспадаркі, укараненне агратэхнічных мерапрыемстваў павінны значна павялічыць ураджайнасць соцыялістычных палёў.

Грандыёзнае будаўніцтва намечана па чыгуначнаму, воднаму і аўтадарожнаму транспарту. Парк аўтамабіляў будзе павялічан на 1/I-38 г. амаль у 8 разоў—з 75 тысяч у 1933 г. да 580 тысяч.

„Шырока павінна быць разгорнута будаўніцтва сеткі грунтавых і шасейных шляхоў з ліквідацыяй ў асноўным бездарожжа".

Праграмай другой пяцігодкі прадугледжан бурны рост прамысловых прадпрыемстваў у нацыянальных раёнах, што „забяспечвае знішчэнне гаспадарчай і культурнай адсталасці нацыянальных рэспублік і абласцей, больш раўнамернае размяшчэнне прадукцыйных сіл і набліжэнне прамысловасці да крыніц сыравіны, спецыялізацыі асноўных раёнаў па сельскагаспадарчых культурах і галінах, завяршэнне эканамічнага раянавання краіны ў цэлым".

Так, у Заходняй вобласці, Горкаўскім краі і БССР ствараюцца па ільняной прамысловасці магутныя базы па пераапрацоўцы.

Планам прадугледжана таксама інтэнсіўнае развіццё будаўніцтва ў галіне асветы, аховы здароўя, мастацтва, друку ў нацыянальных рэспубліках і абласцях.

Характэрнай рысай другой пяцігодкі з'яўляецца рэзкае палепшанне матэр'яльна-бытавога і культурнага абслугоўвання працоўных.

Колькасць рабочых і служачых у канцы другой пяцігодкі павялічыцца на 30 проц., па буйнай прамысловасці—на 40 проц.

Вызначан рост рэальнай зарплаты ў 2,1 разы, павялічэнне норм спажывання па мясу, тлушчах, рыбе, яйках, цукру і прамтаварах у 2,5—3 разы, зніжэнне рознічных цэн на 35—40 проц., павялічэнне ахопам грамадскім харчаваннем рабочых і працоўных горада і вёскі ў два з паловай разы.

Дзяржаўныя выдаткі на культурна-бытавое абслугоўванне працоўных павялічваюцца з 4,3 млрд. да 9,3 млрд. руб., што дае рост за пяцігодку больш, чым удвая.

Будзе праводзіцца ўсеагульнае абавязковае палітэхнічнае навучанне ў аб'ёме сямігодкі, як у горадзе, так і на вёсцы. Вызначана шырокае развіццё пазашкольнай работы (праз клубы, бібліятэкі і і інш.), значнае разгортванне работы па ахове здароўя.

Колькасць бальнічных месц будзе павялічана ў гарадох на 44 проц., у сёлах—на 98 проц. ясельных месц у гарадох на 164 проц., у сёлах—на 129.

За пяцігодку будзе павялічана колькасць гарадоў з водаправодамі з 366 да 440, з каналізацыяй з 55 гарадоў да 125, з трамваям з 50 да 70.

Для ажыццяўлення гэтай праграмы вызначана капітальнае ўкладанне ў комунальнае, жыллёвае і культурнае будаўніцтва другой пяцігодкі ў суме 32 млрд. руб., або чверткі ўсіх капіталаўкладанняў народнай гаспадаркі.

Велізарную ролю ў справе павышэння матар'яльнага ўзроўня рабочых і сялян адыграе разгортванне тавараварота, рост якога вызначан да канца пяцігодкі ў два з паловай—тры разы, на аснове ўтраення вытворчасці прадметаў шырокага спажывання па лёгкай і харчовай прамысловасці і палепшання забеспячэння горада сельска-гаспадарчымі прадуктамі.

Ажыццяўленне гэтай разгорнутай вялізарнейшай праграмы соцыялістычных работ патрабуе значнага палепшання якасці работы на ўсіх участках, умацавання свядомай соцыялістычнай дысцыпліны працы, барацьбы за ўкараненне гасразліка ва ўсе звенні нашай гаспадаркі.

Выкананне задач другой пяцігодкі, якія вядуць да канчатковай гібелі апошніх рэшткаў капіталістычных элементаў, будуць суправаджацца абвостранай класавай барацьбой, спробамі падрыва з боку кулацтва, спробамі шкодніцкага сабатажа нашых прамысловых прадпрыемстваў з боку антысовецкіх, нацдэмаўскіх, шовіністычных сіл.

Гэта патрабуе павышэння класавай пільнасці, умацавання дыктатуры пролетарыята, рашучай барацьбы з супраціўленнем кулацкіх недабіткаў, рашучай барацьбы з усялякімі праявамі апартунізма, цёк у рабоце.

Важнейшай умовай выканання велічэзных задач другой пяцігодкі з'яўляецца палепшанне кіраўніцтва ўсімі ўчасткамі соцыялістычнага будаўніцтва, што патрабуе карэннай перабудовы ўсіх звенняў партыйнага і совецкага апарата.

Гэтая перабудова і вызначана ў тэзісах тав. Кагановіча па арганізацыйных пытаннях, якія даюць ключ да ажыццяўлення праграмы вялікіх работ у другой пяцігодцы.

Тэзісы тав. Кагановіча вызначаюць ліквідацыю функц яналкі ў партыйным і совецкім апараце, перабудову аддзелаў абкомаў, крайкомаў, ЦК нацкампартый, ЦК ВКП(б) у цэласныя, вытворча-галінныя аддзелы, перабудову ўсіх совецка-гаспадарчых арганізацый па вытворча-тэрытарыяльнай адзнацы, устанаўленне цвёрдага адзіначалля, перабудову і ўмацаванне органаў партыйна-совецкага кантроля.

Большэвіцкае ажыццяўленне арганізацыйнай праграмы, ажыццяўленне новага статута партыі—забяспечаць канкрэтнае аперацыйнае кіраўніцтва выкананнем вялікага плана работ.

Ажыццяўленне задач другой пяцігодкі, пяцігодкі карэннага ўздыма жыццёвага ўзроўня рабочых і сялянскіх мас выкліча новы энтузіязм працоўных, новы прыліў вытворчай актыўнасці, больш энергічную барацьбу за аўладанне тэхнікай.

Рабочы клас Совецкага Саюза разам з калгасным сялянствам яшчэ больш згуртуюцца вакол Ленінскай партыі і яе ЦК, на чале якога стаіць геніальнейшы правадыр сусветнага пролетарыята, верны ленінец—тав. СТАЛІН, для будаўніцтва новага радаснага жыцця. Поспехі гэтага будаўніцтва робяць Совецкі Саюз магутнай і непераможнай краінай у свеце.

М-я.



Выпуск трактароў з канвеера на Харкаўскім трактарным заводзе.

ВІКТАР КАЗЛОЎСК

ПРАДЗІЛЬШЧЫЦА ТАНЯ

(*Нарыс*)

На ўскраіне горада дарога павярнула налева. Дзяўчына з клумкам за плячыма сышла з дарогі і спынілася каля расчыненай брамы. З орамы рушыуся ояскконцы паток фаорычных рабочых і раоотніц. Дзяўчына старанна ўглядаецца ў твар кожнага прахожага, імкнучыся сустрэць знаёмага. Усе прайшлі. Сваіх знаёмых яна не уоачыла. Яна хацела спыніць каго-неоудзь з раочых і запытаць пра фабрыку, але ўжо нікога не оыло. Яна памкнулася ісці на фабрычны двор. Міліцыянер патраоаваў пропуск і яна вярнулася. Перайшла на другі бок вулкі, зняла клунак і прысланілася ля загардзі, што абводзіць невялічку трохкутную пляцоуку. На сярэдзіне пляцоукі высіцца фігура з прасцертай рукою. Позірк дзяўчыны спыняецца на помніку.

Яна прыгадвае 23 год.

Яе—невялікую дзяўчынку павезлі ў Маскву. Вялікі горад, павільены, выстаука. І вось на трыоуне ўздымаецца чалавек з прасцёртаи рукою. Вакол трыбуны тоупяцца многатысячныя калены працоўных. Перад ёй вырысоўваецца жывы вобраз Леніна. Ен стаіць і гаворыць, заклікае да змагання, да працы, да оудауніцтва.

І яна—Таня Небялухава з зацятым дыханнем разам з усім многатысячным натоупам слухае вялікага правадыра і настауніка пролетарыята.

Такім, менавіта, хацела яна бачыць Леніна ў Маскве, калі ездзіла на сельска-гаспадарчую выстаўку. Але так і не ўдалося ёй пабачыць яго жывога... Так... А ён жыве... яго справа—нашая справа.

Яна павярнула галаву. Перад яе вачыма горда развінуліся фабрычныя карпусы на шырокай плошчы былой снежнай пусткі.

Таніна рука міжвольна пацягнулася да грудзей. Яна пальцамі дакранулася да КІМаўскага значка. Узяла клунак пад паху і пашла ў кантору.

Яе павялі на фабрыку.

Велізарная, прасторная заля прадзільнага корпуса напаўняецца нейкім дзіўным своеасаблівым гулам. Не, гэта не гул! Гэта нейкая незразумелая стройная музыка. Сотнямі галасоў яна вырываецца з паднакрывак металічных цэнтрафуг, звініць, пераліваецца тысячамі тонаў і зліваецца ў адну сугучную, плаўную, няспынную мелодыю.

Стройнымі радамі працягнуліся ўздоуж корпуса прадзільныя машыны. Павольна вагаюцца—падымаюцца і апускаюцца вадзілы, трымаючы у сваіх жалезных лапках невялічкія шкляныя леячкі. Цягучая, вадкая шоўкавая нітачка падымаецца ўгору, абгібае шкляное колца „галету" ды імклівa імчыцца ўніз, праз шкляную леячку ў цэнтрафугу. Ніоы празрыстыя слязінкі, сцякаюць з бліскучых нітачак кропелькі вадкай хімічнай рашчыны. Быццам тысячы бліскучых металічных струн, напінаецца гэтыя тонкія празрыстыя нітачкі. І здаецца, што гэтая дзіўная музыка ў выглядзе празрыстых кропеляк сцякае з гэтых імклівых, бліскучых струн-нітачак.

Паоапал машын стаяць з падкасанымі рукавамі рабочыя і работніцы. У 5 агрэгаце, у сярэднім радзе стаіць ля сваёй машыны пажылы рабочы. Ён апускае канец шоўкавай нітачкі ў лейку, бярэ жменяй, у так званай, ванне вадкую рашчыну і плюхае на нітку. Нітка заліта. Пад напорам вадкасці яна ўскаквае ў лейку і шпарка імчыцца ў цэнтрафугу.

— Вось вам, таварышы, новая работніца. Мы яе да вас прымацоўваем. Вучыце яе як прасці шоўк.

Дзядзька з рыжай барадой, стары вопытны рабочы, лагодна звярнуўся да Тані: „як зваць". І працягнуў ёй сваю замурзаную, мокрую руку.

— Што-ж, прыступім.

Ён павярнуў правай рукою фільтрадук і дастаў яго з ванначкі. Відаць было, як праз дзірачкі на патоўшчаным канцы гэтай крывулькі выцякала цягучая вадкасць.

— Вось гэта булдавешачка,—тлумачыў ён,—называецца... якбо яна называецца, забыўся, здаецца, фер'ера. У ёй ёсць 24 дзірачкі. Праз іх выцякае вось гэтая, падобная да патакі, вадкасць. У гэтай ванне з хімічнай рашчынай яна згушчаецца і выцягваецца ў нітачку.

Ён апусціў крывульку ў ванну і пачаў запраўляць нітку.

— Дык вось, Танечка, як трэба выводзіць нітку. Мы ўжо добра ведаем гэтую справу, вывучылі, асвоілі. Самі—майстры, тэхнікі, інжынеры. А раней у нас запраулялі тэхнікай буржуазныя спецы. Іх было—30 чалавек. Яны толькі вывуджвалі наша золата, а свае справы добра не ведалі ці не хацелі ведаць. Прыгадваецца мне час, калі выводзілі ў лабараторыі першую нітачку. Доуга пацеў нямецкі спец Раут. І ніяк у яго не выходзіла. А наш совецкі спец—самавучка т. Аронаў узяўся за гэтую справу і ў яго вышла.

У гэтым прадзільным корпусе працаваў замежнік—барон Кагорн. Зараз на яго месцы майстар Бажанаў—наш раочы. Ён не праходзіў ні тэхнікумаў, ні інстытутаў, а справу ведае добра. Навучыліся. Цяпер няма ніводнага оуржуазнага спеца. Спраўляемся самі.

— Але-ж, таварыш, вельмі складаная работы,—перабівае яго Таня.

— Нічога. Гэта так здаецца на першы раз. Навучыся, будзеш працаваць сама, Ы!—яшчэ як працаваць.

* * *

Таня пачала прыглядацца да работы. Яе шэф—настаўнік, як яна назвала старога прадзільшчыка, паказваў ёй як трэба абыходзіцца з машынай, як выводзіць і заліваць нітку, як устаўляць лейку і вымаць „кулічы" шоўкавай пражы. Ён тлумачыў кожную дэталь машыны, як з ёй абыходзіцца.

Праз некалькі дзён Таня ўжо сама выводзіла ніткі і рабіла заліўку. Яе паставілі на 20 верацён, а пасля на 48—на адзін бок машыны. Пад наглядам рабочага і пры яго дапамозе яна спраўлялася з работай. А праз два тыдні яе паставілі ва два бакі.

— Як гэта? Я такая маладая работніца і раптам аднолькава са старымі вопытнымі рабочымі! 96 верацён!

Яна хвалюецца, непакоіцца і разам з тым радуецца за даручаную ёй работу.

— Мне давяраюць! А як-жа не даверыць, я-ж спраўлюся. Я ж комсамолка і павінна апраўдаць надзеі нашай ячэйкі, назву комсамолкі. А ці-ж здолею я сама. Адна, без дапамогі,—непакоілася Таня.

Яна паправіла сваю накруглазавязаную белую хустачку і пашла ўздоўж машыны. Пільна ўглядаецца ў павольнае хісганне вадзіл і бясконцы, няспынны рух шоўкавых нітак.

Перад ёй паўстала далёкая мінуўшчына. Сядзіць, гэта, старэнькая маці калі лучніка і прадзе кудзелю. Доўга-доўга, усю ноч яна сядзіць і выводзіць тоўстыя, зрэбныя ніткі на кашулю. Пяе сумную песню. А яна—маленькая Таня—памагае ёй віць у клубкі...

А гэта...—дзіву даешся. Бягуць, гэтак шпарка бягуць і такія тоненькія, далікатныя нітачкі. Шоўк, самы сапраўдны шоўк! І пойдзе гэты шоўк у нашую „Пролетарскую комуну“ і будзе шамрэць шоўкавым убраннем ні пан, ні буржуй, а нашыя комунары, нашыя рабочыя, мая старэнькая маці.

Фабрычны гадзіннік паказвае дзве з паловай. Пара вымаць пражу. Таня заходзіць ад краю і пачынае абрываць ніткі па парадку на 8-мі верацёнах. Цэнтрафугі спыняюцца. Абарваныя ніткі намотваюцца на „галеты“. Яна асцярожна вымае лейку, здымае накрыўку і дастае цэнтрафугу. Пасля падыходзіць да скрынкі, перакульвае дагары цэнтрафугу і акуратна вымае „куліч“ шоўкавай пражы. Выняўшы 8 „кулічоў“, яна першую чаргу цэнтрафуг пускае ў ход і прыступае да другой. Зняла 48 „кулічоў“ і пераходзіць на другі бок. На другім баку яшчэ 48... І зноў машыны пушчаны ў ход.

— А якія прыгожыя, роўненькія, гладзенькія! Сапсаваных—ніводнага!

Яе ахапіла нечуваная радасць.

— Выходзіць нішто. Дык я-ж магу працаваць і павінна працаваць так, каб не толькі не адстаць ад іншых, а і перагнаць іх.

Гэта быў першы дзень Танінай самастойнай работы пры машыне.

На другі дзень здарылася вялікае няшчасце. Таня надоўга запомніла гэты дзень. Яна спяшалася рабіць з'ёмку. Недагледзела і неспраўна паставіла дзве цэнтрафугі. Вышлі два „кулічы“ няроўныя.

— Брак! Брак! Як гэта можна? Я—бракароб!?

Таня, прыгнечаная і занепакоеная, ішла з работы. На фабрычным дварэ яна спынілася ля чорнай дошкі і прачытала прозвішчы адстаючых і бракаробаў.

— От, заўтра і я буду занесена ў гэты спіс. А што скажа комсамольская ячэйка, як мне паказацца на вочы... Не, больш браку не дам. Трэба добра піль-

т. Горэгляд—лепшая ўдарніца Менскай швейнай фабрыкі імя Крупскай, герой першай пяцігодкі.

наваць, акуратна глядзець за кожнай цэнтрафугай.

* * *

Комсамольская ячэйка абвясціла паход за авалодванне тэхнічнымі ведамі, за павышэнне палітычнай асветы. Таня пачала наведваць комсамольскую палітшколу і гурток тэхвучобы. Кіраўнік тлумачыў кожную частку, кожную дэталь машыны, як з імі абыходзіцца, як працаваць, каб не было браку.

Таня добра вывучыла сваю справу. Калі не хапала ў цэху рабочых, яе перавялі працаваць на тры бакі—144 верацёны. І яна спраўлялася. Робіць з'ёмку па чарзе. Наладзіць добра работу на двух баках, а на трэцім—здымае. Зробіць заліўку на першым, пераходзіць на другі, а пасля і на трэці бок...

Парт'ячэйка гаварыла аб соцспаборніцтве, аб індывідуальным шэфстве.

І Таню, як лепшую ўдарніцу, прымацавалі да адстаючай работніцы. Яна ёй дапамагае, паказвае, як зрабіць заліўку, як зняць „куліч“. Тлумачыць:—„лейку не дасадзіш—брак, нероўна выходзіць „куліч“. Калі не добра паставіш цэнтрафугу, неправільна надзенеш накрыўку, кранеш гайку—брак, „куліч“ з губой. Нікуды не варта!“

— Хто лепш, хто больш?—Паспрачалася Таня з работніцай Араксай і падпісалі ўмову на соцспаборніцтва. І Таня вышла пераможніцай.

— Зараз наш пяты жаночы агрэгат,—дакладвае яна комсамольскай ячэйцы,—спаборнічае з чацвёртым—мужчынскім. І наш агрэгат ідзе наперадзе, як па якасці, так і па колькасці.

— А як ты,—перабівае сакратар ячэйкі? Таня замялася. З-за плячэй пачуўся голас.

— Яна пераганяе ўсіх!

— У чацвёртым мужчынскім — працягвае Таня,—лепш працуе Цыбульскі. Ды вось толькі ён малапісьменны, у вучобе адстае. Трэба яму дапамагчы...

Урачыста адбывалася прэміяванне лепшых ударнікаў. Тані прыпаднеслі шоўк на плацце. У адказным слове Таня сказала:

— Мы—прадзільшчыкі, змагаемся за пераходны чырвоны сцяг фабрыкі. Мы яго павінны адваяваць у тэкстыльнага корпуса і адваюем...

* * *

Быў мароз. Снежаньскі студзёны вецер ружаваў смуглявы твар Тані. Яна ішла на ўрачыстасць. Пяты жаночы агрэгат разам з усім рабочым калектывам святкаваў перамогу. Фабрыка рапартавала краіне.—11 снежня 1933 года Магілёўская шоўкавая выканала датэрмінова прамфінплан першага года другой пяцігодкі.

Таня стаяла ля помніка Леніна і чакала сваіх таварышак з другой комсамольскай брыгады мальшчыц.

Перад ёй зноў праплылі далёкія малюнкі яе падарожжа ў Маскву... Ленін стаіць на трыбуне і заклікае да змагання, да працы, да будаўніцтва. Ёй такім хацелася яго ўгледзець, але яна не бачыла яго жывога... Так... Але яго справа жыве.

ІМІ ГАНАРЫМСЯ

„Вставай, не спи, кудрявая, в цехах звеня“.., чырвонашчокая, жвавая дзяўчына хутка ўключыла матор і лашчыльная машына заглушыла яе мілагучны голас.

Скуры адна за другой падкладаліся пад каток машыны і адтуль выходзілі мякчэйшымі, гладкімі, бліскучымі.

* * *

Стася прышла на завод у 1929 г. з дзіцячага дома, калі ёй было 16 год. Кіпучае жыццё завода, задорная моладзь хутка ўцягваюць яе ў рады ленінскага комсамола. Стася комсамолкай з 1930 года.

— А як у вас з промфінпланам,—пытаемся мы і зразу атрымоўваем адказ.

— У нас ужо прывычкай стала выконваць план, інакш мы і не думаем. Вось, праўда, у чацвёртым квартале быў у цэху прарыў, бо ішоў новы від сыравіны—лайка, і мы яшчэ добра не ведалі, як яе трэба апрацоўваць. Але хутка на гэта рэагавалі.

Я, як прафорг, склікала брыгаду, абмеркавалі, што патрэбна сур'ёзна аўладаць тэхнікай сваёй справы, бо без гэтага далей не паедзеш. Ушчыльнілі рабочы дзень, сталі працаваць 420 хвілін, павялі барацьбу з прагуламі, прастоямі, сталі добра прыглядацца да работы, ну і, вядома, з прарыва вылезлі.

Многа ўсякай іншай работы праводзіць Стася ў брыгадзе. Абвешчан вытворчы паход імя тав. Гікало. Ударная брыгада лашчыльшчыкаў першай уключаецца ў гэты паход. На чале пахода, душою яго, становіцца Стася Бэльфус. Брыгада ўзяла на сябе абавязкі да партз'ездаў, якія рэгулярна правяраюцца і вынікі вывешваюцца на дошцы.

У выніку паходу імя Гікало і падрыхтоўкі да з'ездаў прамфінплан брыгада выканала на 117 проц. Значна зніжан брак. Штодзённа праводзяцца дзесяціхвілінныя вытворчыя нарады, на якіх завастраюцца пытанні аб якасці і тэмпах работы. Кожны дзень акуратна чысцяцца машыны. За правядзеннем гэтай работы сочыць асабіста прафорг брыгады тав. Бэльфус.

Адрамя гэтага Стася яшчэ і культпроп комсамольскай ячэйкі хромавага цэха. Вучоба ў ячэйцы была ў загоне, Стася моцна ўзялася за наладжванне цікавай, жывой работы ў палітгурку. У выніку гэтага ўсе комсамольцы актыўна наведваюць палітзаняткі.

Усе комсамольцы ячэйкі выпісваюць і чытаюць газеты, часта арганізоўваюцца калектыўныя паходы ў кіно і тэатр.

Сама-ж тав. Бэльфус прамфінплан за трэці квартал выканала на 147,5 проц., за снежань на 130 проц. Замест нормы ў 530 скур, яна робіць 600—630 скур.

Тав. Бэльфус паказвае прыклад барацьбы за аўладанне тэхнікай, добра ведае, чым жыве ея машына, як трэба рамантаваць, як з ёю абыходзіцца, каб не псавалася.

Не здарма-ж і тэхэкзамен здадзен на „вельмі добра“. Не было ніводнага пытання, на якое-б яна не адказала. За добрыя поспехі ў аўладанні тэхнікай Стася прэміявана грашыма на 100 рублёў і атрымала тэхнічную аблігацыю, па якой выйграла шасцітомнік Леніна.

Стася не толькі сама добра аўладала тэхнікай свайго варштата, але ўзяла на буксір Марголіна, які не паспяваў у тэхвучобе, вучыла яго і ў выніку ён таксама здаў тэхэкзамен.

Тав. Бэльфус за сваю самаадданую, сапраўды ўдарную работу на заводзе прызнана рабочым калектывам героем першай пяцігодкі. Яна, безумоўна, гэтага заслугоўвае.

Стася не толькі лепшая ўдарніца вытворчасці, яна яшчэ вельмі цікавіцца фізкультурай, спевамі, стральбой, палітграматай. Займаецца ў комсамольскай палітшколе, трэніруецца на здачу норм на значок Варашылаўскага стралка, вывучае любімыя спевы: „Кудрявую“ і „Гавань“.

Зараз Стася многа думае аб вучобе, яна хоча быць інжынерам, і, безумоўна, ім будзе. Стася 1913 г. нараджэння. Яе рост цесна звязан з ростам маладой краіны. Стася з новымі поспехамі сустракае новы год. Яна ўпэўнена глядзіць у будучыню, якая ёй абяцае яшчэ больш цікавае і радаснае жыццё.

* * *

Гудок. Матор спыніўся. Стася спявае „Страна встаёт со славою навстречу дня“ і спяшаецца на лыжную вылазку.

* * *

На многа выраслі за апошнія гады работніцы завода „Большэвік“. Калі ў 1927 годзе было работніц усяго 10—15 чалавек, ды і тое на некваліфікаваных работах, то зараз і ёсць ужо 160, з якіх некаторыя працуюць на самых кваліфікаваных работах. На лашчыльных машынах, футамерах, дваільных машынах—усюды можна бачыць работніц. Задача завода—яшчэ больш рашуча прасоўваць работніц на больш кваліфікаваныя работы.

На заводзе ёсць больш 7 жанчын—герояў першай пяцігодкі, 145 жанчын ахоплена рознымі відамі тэхвучобы, здалі тэхэкзамен каля 25 работніц. За добрае наведванне і пяспяховасць у тэхвучобе з 121 тэхаблігацый, раздадзеных на заводзе, 28 арымалі жанчыны.

На заводзе 10 жанчын актыўна працуюць у дэпутацкай групе. Ёсць некалькі членаў гарсовета і член ЦВК СССР тав. Нахамава, якая вучыцца зараз на курсах чырвоных дырэктароў.

Ленін памёр, але ленінскія заветы—аб тым, што кожная кухарка павінна ўмець кіраваць дзяржавай, моцна жывуць у мільённых масах працоўных Совецкага Саюза і праводзяцца імі ў жыццё.

Куніна.

Менск. Завод Большэвік.

У сувязі з бурным ростам соцыялістычнай прамысловасці БССР бесперапынна павялічваецца колькасць і ўдзельная вага работніц у прамысловасці БССР.

На 1/I-32 года у прамысловасці было занята 38.940 жанчын, або 41,4 проц. да агульнага ліка прамысловых рабочых, на 1/I-33 г.—41.000 жанчын або 44,1 проц.

Па Віцебску колькасць работніц складае цяпер 53 проц. агульнай колькасці рабочых, па Менску—48 проц.

Ліст з фордонскай жаночай турмы

Фордон—гэта маленькае мястэчка ў Польшчы на германскай мяжы.

У фордонской турме сядзяць выключна жанчыны, якія асуджаны на шматгадовую катаргу. З агульнай колькасці палітзняволеных жанчын 60—70 проц. з Заходняй Беларусі. Лісты, напісаныя на беларускай і украінскай мовах, у турму не перадаюцца. Таксама забараняецца пісаць адказы на гэтых мовах. Таму многія украінскія і беларускія таварышы пазбаўлены магчымасці пісаць лісты да сваякоў і атрымліваць ад іх, бо іхнія бацькі другой мовы, акрамя украінскай або беларускай, не ведаюць. У апошні час умовы вельмі пагоршыліся. Турэмны рэжым вельмі цяжкі, за кожную дробязь караюць, за кожны пратэст атрымоўваем карцэр. За тое, што глядзім праз вакно, забіраюць ад нас на доўгія тыдні сяннікі і ложкі.

Колькасць хворых у нас з кожным днём павялічваецца, не кажучы ўжо аб тым, што „здаровыя" так знясілены, што ледзь трымаюцца на нагах. У апошні час у тав. Пейсаховіч—тэкстыльшчыцы з Беластока, на глебе знясілля з'явіўся на воку нарыў і яна, мабыць, застанецца сляпой, бо турэмная адміністрацыя адмаўляецца яе лячыць.

Турэмны доктар адносіцца да палітзняволеных горш, чым да сабакі, аглядае часта хворага праз візотэрку (дзірачка ў дзвярах), зусім не заходзячы ў камеру. Аб медычнай дапамозе не можа быць і гутаркі.

Не гледзячы на ўсё гэта, настрой у комуне вельмі бадзёры і добры. Мы знаходзім розныя работы, нават без кніг, і часу дарма не трацім. Стараемся не адрывацца ад агульнага жыцця і барацьбы. Кожная маленькая звестка аб далейшых дасягненнях рэволюцыйнай барацьбы ў Польшчы, кожнае дасягненне аб соцбудаўніцтве ў СССР—выклікаюць у нас новыя сілы, мужнасць і гатоўнасць да барацьбы.

Н.

Верасень 1933 г.

„У той час, як СССР, аплот міжнароднага пролетарыята і прыгнечаных народаў, разгортвае сваё соцыялістычнае будаўніцтва і ўсё вышэй узнімае сваю магутнасць—эканоміка капіталістычнага света разваліваецца. Усё тужэй зацягваецца пятля галечы, зруйнавання, голада. Буржуазія шалёна ўзмацняе свае эканамічныя спосабы эксплаатацыі метадамі фашысцкага гвалта, аграблення працоўных класаў і шляхам драпежніцкіх войн супроць другіх народаў. Але ў той-жа час усё больш расце рэволюцыйнае абурэнне працоўных мас і іх гатоўнасць да звяржэння невыноснага ўціску эксплаататарскіх класаў".

„Прыклад СССР—гэта прыклад б о л ь ш э в і з м а. Толькі г э т ы прыклад указвае выхад і выратаванне эксплаатуемым і прыгнечаным усіх імперыялістычных і каланіяльных краін.

Прыклад большэвізма—гэта прыклад пролетарскага інтэрнацыяналізма. Перамога соцыялістычнай рэволюцыі магчыма толькі шляхам умацавання міжнароднай сувязі рэволюцыйнага пролетарыята. Шлях большэвізма—гэта шлях злучэння пролетарскіх сіл усіх нацыянальнасцяй і рас, шлях іх сумеснай барацьбы рука аб руку з совецкім пролетарыятам супроць прыгнятальнікаў і эксплаататараў".

(З тэзісаў, прынятых 13 пленумам ВККІ па дакладу тав. Куусінена).

Японскія беспрацоўныя дзяўчаты на біржы працы.



На здымку—выкінутая на вуліцу сям'я зруйнаванага амерыканскага фермера, яго маёмасць была распродана за даўгі і неўплату падаткаў.

15 год

ДЗЯКУЮЧЫ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫ
БЕЛАРУСЬ—ЗАРАЗ БССР ПЕРАТВАРЫЛАСЯ Ў АД

„Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК ВКП(б) на чале з тав. СТАЛІНЫМ, пры аграмаднай дапамозе Совецкага Саюза, на аснове індустрыялізацыі і соцыялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі, на аснове цвёрдага правядзення генеральнай лініі партыі і бязлітаснай барацьбы супроць апартунізма і нацыяналізма рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б дабіліся рашаючых поспехаў у справе канчатковай ліквідацыі былога каланіяльнага

Першы сакратар ЦК КП(б)Б т. ГІКАЛО



Новы Менск

Фото С. Грына

На здымку—новыя гіганты БССР, пабудаваныя ў першай пяцігодцы: 1) Віцебская швейная фабрыка „Сцяг Індустрыялізацыі", 2) Віцебскі мясны камбінат, 3) Крычаўскі цэментны завод, 4) Віцебская панчошна-трыкатажная фабрыка „КІМ", 5) Гомсельмаш, 6) Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, 7) Касцюковіцкі шкло-гігант, 8) Барысаўская запалкавая фабрыка „Пролетарская перамога".





Старшыня ЦВК СССР і БССР т. ЧЭРВЯКОЎ

БССР

ПАРТЫІ РАНЕЙ АДСТАЛАЯ, ПРЫГНЕЧАНАЯ З ПЕРАДАВЫХ РЭСПУБЛІК СОВЕЦКАГА САЮЗА

становішча Беларусі і звязанай з гэтым эканамічнай і культурнай адсталасці.

БССР сустракае 17 з'езд ВКП(б) і 15 гадавіну свайго існавання, як адна з перадавых рэспублік Совецкага Саюза, ператварыўшыся ў індустрыяльна-аграрную краіну, дабіўшыся росквіта (перамогі) беларускай культуры, нацыянальнай па форме, пролетарскай па эместу".

(З пастановы аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б).



Сакратар ЦК КП(б)Б т. ШАРАНГОВІЧ.



Фото ГРЫНА.



Старшыня СНК БССР, т.

ЖАНЧЫНА У КАЛГАСАХ — ВЯЛІКАЯ СІЛА

Больш 100 жанчын—калгасніц БССР працуе зараз старшынямі калгасаў, больш 200—намеснікамі старшынь, 578 брыгадзірамі і 600 чалавек—загадчыцамі МТФ і СТФ.

Старшыня калгаса Дзюбанава— лепшы барацьбіт за высокаякасны лён

Калгас „Луч“ спачатку яго арганізацыі знаходзіўся ў глыбокім прарыве. Не было моцнай кіруючай рукі ў калгасе. І вось у 1933 годзе парт'ячэйка вылучыла ў якасці старшыні калгаса Дзюбанаву Насту, якая энергічна ўзялася за работу.

Спачатку цяжка было т. Дзюбанавай. Гады не маладыя, за 56 пераваліла ўжо, ды і вопыта кіруючай работы ў яе не было... Многа сіл прышлося пакласці на барацьбу з кулацка-антысовецкімі элементамі, якімі калгас „Луч“ быў моцна засмечан. Але з дапамогай партыйнай ячэйкі, сельсовета і добрасумленных калгаснікаў калгас „Луч“ перамог.

Закіпела работа. Сяўба, праполка і ўборка ўраджая былі скончаны своечасова і без страт. З дзяржавай калгас разлічыўся



Тав. Безлюдава—старшыня калгаса „Чырвоная змена“, Аршанск. р-на.

раней тэрміна, высокаякасным збожжам і бульбай.

Настаў час апрацоўкі і здачы ільна дзяржаве. У мэтах паспяховага завяршэння ільназагатовак тав. Дзюбанава вылучыла спецыяльныя звенні па сартоўцы ільна, па адвозцы яго на ільназавод.

У выніку правільнай расстаноўкі сіл калгас датэрмінова перавыканаў план ільназагатовак на 58 проц., захаваўшы высокую якасць.

Калгас „Луч“ — перадавы не толькі ў сельсавеце, але і ў раёне, у чым вялікую ролю сыграла тое, што на чале яго стаіць нястомны барацьбіт, лепшая ўдарніца—Дзюбанава Наста.

Цітова.

Лёзнянскі раён.

ЗМАГАЕМСЯ ЗА БОЛЬШЭВІЦКІ КАЛГАС, ЗА ЗАМОЖНАЕ ЖЫЦЦЁ

На сходзе калгасніц калгаса імя Урыцкага быў прапрацован ліст да тав. Сталіна ад калгасніц Совецкай МТС, Паўночнага Каўказа.

У спрэчках калгасніцы гаварылі аб добрых выніках у сваім калгасе ў параўнанні з мінулым годам. Тав. Аксёнава адзначыла, што жанчыны працавалі па-ўдарнаму, упарта змагаліся са стратамі, працавалі па ільну і днём і ўночы, таму калгас першы ў сельсавеце перавыканаў ільнозагатоўкі, здаўшы звыш плана 2 тоны трасты.

Калгасніца тав. Сініцкая ўказала, што план па збожжу і бульбе поўнасцю выканан, засыпана добраякаснае насенне звыш 100 проц. плана, улічваючы пашырэнне пасеўнай плошчы 1934 г. Выбралі добрых ударнікаў у конюхі, коні і жывёла знаходзяцца ў цёплых хлявах.

У калгасе імя Урыцкага ў мінулым годзе прыходзілася на працадзень 1 *кг* збожжавых і 500 грам бульбы, у гэтым-жа годзе вага працадня—3 *кг* збожжавых і 3 *кг* бульбы.

Сёлета жанчыны выходзілі на работу раней і кожная змагалася за працадні.

Усіх гэтых поспехаў калгас дабіўся дзякуючы кіраўніцтва палітаддзела, што было адзначана і на сходзе.

У калгасе ёсць добрыя ўдарніцы, як Лазоўская, Пятухова і Аксёнава. Сход пастанавіў т. Лазоўскую і Пятухову вылучыць на кіруючую работу ў калгасе.

Але ёсць і ілжэ ўдарніцы, якія неакуратна выходзілі на работу і за ўвесь час маюць толькі па 74 працадні. Такімі з'яўляюцца Лапухова і Цыбульская.

У заключэнне сход заклікаў усіх калгасніц сельсовета выканаць ільнозагатоўкі, добра падрыхтавацца да веснавой пасеўнай кампаніі, падрыхтаваць увесь інвентар і поўнасцю засыпаць добраякасным збожжам насенныя і страхавыя фонды.

Анюта.

Сіроцінскі раён.

ЗА ДОБРАЯКАСНЫ ЛЕН

У калгасе „Працоўны сцяг“ разгорнута масавая апрацоўка ільна і ўдарная здача яго дзяржаве. Ільнотрапальшчыцы добра ўсвядомілі сабе, што, чым вышэйшая якасць ільна, тым лепш для дзяржавы, тым больш яны атрымаюць хлеба і прамтавараў. Вось чаму галоўная ўвага звяртаецца на якасць. Лён калгасам „Працоўны сцяг“ здаецца 8—10 нумарамі і вышэй.

Добрую якасць даюць трапальшчыцы: Капцова Кацярына, якая вытропвае 13 *кг* за дзень, а таксама Курчанка Марфа, Балдышкіна Наста. Іх прыкладу павінны паследваць астатнія калгасніцы.

Цітова.

Лёзнянскі раён.

СТАРШЫНЯ САБАЛЕНКА—ДОБРЫ ГАСПАДАР

Елена Сабаленка ўступіла ў калгас імя Лекерта, Шацілаўскага сельсовета, у 1929 годзе. Яна з першых дзён работы ў калгасе лічыцца лепшай ударніцай. За сваю работу Елена некалькі разоў атрымоўвала прэміі.

Як лепшую ўдарніцу яе калгаснікі пасылалі на ўсесаюзны, а потым і на ўсебеларускі з'езды калгаснікаў-ударнікаў. На з'ездах Елена многаму навучылася. Прыехаўшы дамоў, яна разгарнула масавую работу сярод калгасніц, праводзіла з імі гутаркі, чытала газеты.

Калі ў калгасе апрацоўвалі лён, тав. Сабаленка працавала ад цямна і да цямна. Яна заўсёды перавыконвала норму, даючы валакно 12 і 14 нумарамі.

Вельмі шмат папрацавала Сабаленка над ліквідацыяй абязлічкі на ільноапрацоўцы. Яна дабілася таго, што кожная трапальшчыца да свайго кулька прымацоўвала ярлычок з указаннем прозвішча.

Тав. Сабаленка.

Пры напорыстасці Елены калгасніцы калгаса імя Лекерта дабіліся таго, што іх калгас першым па Шацілаўскаму сельсовету здаў валакно дзяржаве, поўнасцю выканаўшы план.

Членам партыі тав. Сабаленка лічыцца з 1930 года. Яе дачка Клаўдзя — комсамолка і працуе рахункаводам у калгасе імя Лекерга. Зараз тав. Сабаленка працуе старшынёй калгаса „Чырвоная Сосніца", Сосніцкага сельсовета. З першых дзён сваёй работы ў „Чырвонай Сосніцы" Сабаленка даказала, што яна можа быць добрым камандзірам буйнай калектыўнай гаспадаркі. Яна дабілася таго, што яе калгас сустракае XV з'езд КП(б)Б поўным выкананнем плана ільнездачы і сур'ёзна рыхтуецца да вясны.

Р. Канавалаў.

Полацкі раён.

ЖЫВЕЛА ЗІМУЕ У ЦЁПЛЫХ ХЛЯВАХ

Каровы і коні ў калгасе „Полымя" сёлета зімуюць у вельмі цёплых і светлых хлявах. Дасягнулі гэтага таму, што праўленне калгаса своечасова паклапацілася, каб хлявы былі абкладзены саломай, мелі столі і вокны.

За жывёлай наладжан добры догляд, уведзен кантроль за кармамі. Зараз распачата будаўніцтва канюшні на 100 галоў. Канюшня будзе мець радзільнае аддзяленне, аддзяленне для маладняка і шорнае аддзяленне.

Трэба, каб праўленне калгаса „Полымя" не спынілася на дасягнутых поспехах, і яшчэ з большай дзелавітасцю змагалася за большэвіцкую жывёлагадоўлю.

Я. Гаварушка.

Рагачоўскі раён.

КАЛГАС „ПОЛЫМЯ" ПАСПЯХОВА РЫХТУЕЦЦА ДА ВЯСНЫ

У час падрыхтоўкі да XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б) калгасніцы і калгаснікі калгаса „Полымя" узялі на сябе цэлы рад абавязкаў па паспяховай падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. У выніку рэалізацыі абавязкаў засыпаны і ачышчаны насенстрахфонды, вылучан калгаснік, які адказвае за добраякаснае захаванне гэтых фондаў.

Шырока разгорнута работа па рамонту збруі і інвентара. Ужо адрамантавана 18 калёс, набыта 10 новых камплектаў збруі і на 10 камплектаў зроблен заказ.

У хуткім часе пачынаецца вывазка гною. У выніку добрага догляда коняй у калгасе няма ніводнага слабасільнага каня.

Коні стаяць у добра абгледжанай канюшні, якая абіта дошкамі.

Калгас „Полымя" выклікаў на соцспаборніцтва ўсе калгасы другога вытворчага ўчастка МТС на лепшую падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Гаварушка.

Рагачоўскі раён.

Курсы яшчэ не ўкамплектаваны

У Полацкім раёне з 20 снежня павінны былі распачаць сваю работу курсы жанчын старшынь калгасаў. Райза 12 снежня разаслала разнарадку сельсоветам, у якой растлумачвала каго трэба пасылаць на курсы. Але ні сельсоветы, ні МТС да гэтага часу палец аб палец не ўдарылі, каб укамплектаваць курсы і забяспечыць добрую іх работу. Бяздзейнасць і недаацэнка курсаў прывяла да таго, што на 26-е снежня з патрэбнай колькасці жанчын з'явілася толькі 30 проц. Арлейскі, Кушлікоўскі, Алёсаўскі, Даміноўскі, Сястронскі і Тураўлянскі сельсоветы жанчын зусім не прыслалі.

Злачынна і нядбайна аднесліся да ўкамплектавання курсаў інструктары Райза Вільневіч, Краско і Залескі. Яны нават не паклапаціліся аб тым, каб праверыць, як па сельсоветах праходзіць вярбоўка лепшых жанчын-ударніц на курсы.

Адпаведныя арганізацыі павінны сур'ёзна заняцца курсамі і за зрыў падрыхтоўкі кадраў прыцягнуць вінаватых да адказнасці.

Р. Канавалаў
Г. Сталыго.

У час падрыхтоўкі да XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б) значна ўзнялася актыўнасць калгасніц

Калгасніцы калгасаў Наталаўскага польскага сельсовета ўключыліся ў вытворчы паход імя XVII партз'езда. Арганізаваны ўдарныя брыгады з жанчын імя XVII з'езда па лепшай апрацоўцы ільнавалакна і хутчэйшай здачы яго дзяржаве.

Калгас Мархлеўскага датэрмінова выканаў здачу ільна дзяржаве. У другіх-жа калгасах арганізавана кругласутачная апрацоўка ільна.

Калгасніцы калгасаў Мархлеўскага, „Калектывіст", „Чырвоны сцяг", „Новы шлях" і інш. усе падпісаліся на год і паўгода на журнал „Работніца і калгасніца Беларусі".

У калгасе Мархлеўскага жанчыны паставілі пытанне перад праўленнем калгаса аб стварэнні фонда для ясляў на 1934 г.

Калгасы заключылі паміж сабой соцсцаборніцтва на хутчэйшае выкананне ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній.

Калгасніцы Ўбалоцкага сельсовета ўключыліся ў культпаход за чыстую і культурную хату. Вылучылі санітарныя брыгады. Калгасніцы калгасаў „Ударнік" і „Новы свет" змагаюцца за хутчэйшае выкананне палітычна-гаспадарчых кампаній, як загатоўка ільновалакна і вывазка леса, стварылі ўдарныя брыгады з жанчын імя XVII партз'езда па догляду жывёлы.

Калгасніца калгаса „Ударнік" Карчэўская Ганна ўжо другі год даглядае жывёлу. Яе хлявы вельмі добра ацеплены. Адыход маладняка ў яе самы нізкі. Жывёла ў добрым доглядзе. За гэта калгас прэміяваў яе тры разы.

Калгасніцы калгаса „Новы свет" на сходзе закупілі латарэйных білетаў Асоавіяхіма на 54 руб.

Жонкі служачых мястэчка Клічава арганізавалі групу садзейнічання РСІ. Праверылі працу сталоўкі, сельпо, маслапрома і інш., выявіўшы рад недахопаў. Вынікі праверкі перададзены ў РКК-РСІ.

70 жанчын ахоплены паўгадовай падпіскай на журнал „Работніца і калгасніца Беларусі". Больш пісьменныя жанчыны вылучаны праводзіць галосную чытку журнала.

Жанорг Юркевіч Ю. А.

Клічаўскі р.

Буксірнымі брыгадамі, ліквідацыяй прарываў па ільну сустракаюць калгасніцы з'езды партыі

У час падрыхтоўкі да 15 з'езда КП(б)Б і 17 з'езда ВКП(б) па нашаму раёну арганізуюцца жаночыя буксірныя брыгады па праверцы таго, як калгас справіўся з сваімі абавязкамі перад дзяржавай, з засыпкай насення, рамонтам інвентара.

Брыгада калгасніц з 5 чалавек праверыла калгас „Адзінства" і знашла, што там насенне не ачышчана. Сельгасінвентар усюды параскіданы; плуг-трактарны і бароны стаялі на снягу.

Брыгада таксама праверыла кароўнік, які аказаўся не ацяпленым. Увечары правялі сход жанчын, на якім калгасніцы мабілізаваліся на хутчэйшую апрацоўку ільна і здачу лепшага ільнавалакна дзяржаве. На сходзе калгасніцы абавязаліся на працягу 2-х дзён знішчыць усе прарывы ў рабоце, выкрытыя брыгадай.

Тут-жа на сходзе была праведзена падпіска на журнал „Работніца і Калгасніца Беларусі".

На праведзеных сходах калгасніц па Лісімкаўскаму сельсовету асабліва завастрылася пытанне апрацоўкі і здачы ільнавалакна. У выніку гэтага палепшылася якасць здаваемага дзяржаве валакна. Калі да сходаў здаваўся лён 4 нумара, дык пасля сходаў сталі здаваць лён 8 і 14 нумарам.

Разгорнутая масавая работа сярод жанчын мястэчка Чачэрска ў сувязі з партз'ездамі дала новых 200 падпісчыц на журнал „Работніца і калгасніца Беларусі".

Жанорг РК КП(б)Б Жыбуля.

Чачэрск.



Палітвучоба ў калгасе „Чырвоная Змена" (Аршаншчына). Фота С. Грына.

Арганізавалі новую ўдарную брыгаду імя 17 партз'езда

У калгасе „Чырвоны бор", Вяліка Борскага сельсовета, пасля абмеркавання пытання аб уключэнні ў вытворчы паход імя 17 парт'езда была арганізавана ўдарная жаночая брыгада імя з'езда, якая абавязалася лепш і хутчэй апрацаваць тэхнічныя культуры і здаць іх дзяржаве, па ўдарнаму ўзяцца за падрыхтоўку да веснавой сяўбы, для чаго праверыць насенне, інвентар, як даглядаюцца коні, правесці збор попелу, сваечасова паклапаціцца аб адчыненні дзіцячых устаноў. Брыгада абавязалася таксама поўнасцю ліквідаваць сваю непісьменнасць і малапісьменнасць.

Па ўсіх гэтых пунктах брыгада выклікала на соцспаборніцтва калгасніц калгаса „Маяк".

Жанорг РК КП(б)Б Шапавалава

Хойнікі.

Як ажыццяўляецца завет Леніна,

што кожная кухарка павінна навучыцца кіраваць дзяржавай

Больш 1.000 жанчын БССР з'яўляюцца членамі сельсоветаў 563—членамі рэўкамісій, 36 працуюць старшынямі сельсоветаў, 1 старшынёй РВК і 3 намеснікамі старшынь РВК, 46 жанчын з'яўляюцца членамі ЦВК БССР. Наша задача больш рашуча высоўваць жанчын да кіраўніцтва дзяржавай.

Е. Л. ДРЫНАВА*)

„Я хачу падкрэсліць работу жанчын"

Выступленне на сесіі ЦВК СССР па дакладах т.т. Молатава і Межлаука)

— 16 год прайшло з таго часу, як рабочы клас пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі на чале з тав. Леніным узяў уладу ў свае рукі. Дыктатура пролетарыята за 16 год змагла зрабіць тое, чаго буржуазія не магла ажыццявіць за сотні год.

Я працую ў 25 км. ад Гомеля, у Добрушы, дзе ёсць папяровая фабрыка, якая калісці належыла князю Паскевічу. Фабрыка мела раней 5 старых машын. Мы пабудавалі некалькі новых цэхаў і паставілі шостую машыну, якая выробляе больш, чым усе раней-шыя пяць разам.

Нельга маўчаць і аб недахопах, якія мелі месца на нашай фабрыцы. На працягу двух год мы былі ў прарыве. Частка віны ляжыць на нас, на саміх рабочых і на кіруючых работніках, якія не заўважылі ў сваіх радах ворагаў рабочага класа. У нас штодзённа адбываліся аварыі і прастоі, а мы не маглі раскрыць вінаватых. Шэсць месяцаў назад у нас была раскрыта і ліквідавана шайка шкоднікаў, у якую ўваходзілі былыя жандары і белыя афіцэры.

Пасля ліквідацыі гэтай шайкі пачаўся вытворчы ўздым. Рабочыя шчыльней згуртавалі свае рады вакол комуністычнай партыі.

Было арганізавана 217 ударных брыгад, 93 проц. рабочых ахоплены соцспаборніцтвам. Мы дабіліся вялікіх перамог.

Я хачу асабліва падкрэсліць работу жанчын. Не гледзячы на тое, што фабрыка ўвесь час знаходзілася ў прарыве, цэх сартыроўкі, у якім працуе каля 400 жанчын, заўсёды ішоў наперадзе.

Я працую цяпер старшынёй Добрушскага гарсовета. Мы дабіліся ажыўлення работы дэпутацкіх груп. Нашы дэпутацкія групы працуюць не толькі ўнутры фабрыкі, але па за ёю. Звернута сур'ёзная ўвага на грамадскае харчаванне, установлен кантроль у сталоўках, у лекавых установах, дзіцячых ачагах і яслях, прыгарадных гаспадарках. Усё гэта дало вялікія вынікі.

*) *Дрынава Дуня—былая работніца Добрушскай папяровай фабрыкі. На фабрыцы яна працавала 18 год. Толькі пры совецкай уладзе, ужо ў 1929 годзе яна ліквідавала сваю непісьменнасць. У 1926 годзе яна ўступае ў партыю. У 1930 годзе вылучаецца на пасаду старшыні Добрушскага райсовета. За добрасумленную ўдарную работу т. Дрынава некалькі разоў прэміявана. З 1931 года тав. Дрынава член ЦВК СССР.*

УЗЯТЫЯ АБАВЯЗКІ ВЫКОНВАЕМ

У час падрыхтоўкі да XVII з'езда ВКП(б) і XV з'езда КП(б)Б наша брыгада брусоўшчыц імя 8-га сакавіка ўзяла на сябе наступныя абавязкі: перавыканаць прамфінплан на 10 проц., знізіць брак на 10 проц. ніжэй прадугледжаных планам; добра глядзець за машынамі, акуратна наведваць палітгурткі і вайсковыя заняткі; наладзіць калектыўную чытку газет у час абедзенага перапынка, выпускаць штодзёнку і актыўна ўдзельнічаць у ёй. Гэтыя абавязкі мы выконваем не словамі, а справай. Наша брыгада брусаўшчыц на сённешні дзень прамфінплан выконвае на 124,7 проц.

Брыгада рэгулярна выпускае штодзённую газету, кожны дзень у час абедзенага перапынка мы праводзім масавую чытку газет і не толькі чытаем, але і абмеркоўваем некаторы матар'ял, як напрыклад аб міжнародным становішчы і інш.

Калі раней у вячэрніх школах займаліся ў большасці комсамольцы, то зараз школай ахоплены ўсе. Наша брыгада брусоўшчыц уваходзіць у санкаманду СПА, дзе за ўвесь час работы ніхто з нас не мае ніводнага прагула. Наша брыгада першая пачала трэніроўку ў супрацьгазах на рабоце і працавала ў іх на працягу 45 хвілін, пры чым давала добрую якасць прадукцыі і выконвала прамфінплан. У час правядзення комсамольскага суботніка ўся наша брыгада вышла на работу і ў гэты дзень план перавыканала.

Абяцаем і ў далейшым выконваць узятыя на сябе абавязкі.

Брыгада: Пінусовіч Ліза, Левіна Ліза, Юдэлевіч Геня, Гладук Нюра.

Менск, абутковая ф-ка імя Кагановіча.

За заможнае і культурнае жыццё

(На Слуцкай культбытавой канферэнцыі)

Жвава гутараць паміж сабою дэлегаты з калгаса „Колас". Яны расказваюць аб дасягненнях, дзеляцца вопытам.

А дасягненняў многа. Лён здалі датэрмінова 17—18 нумарамі, перавыканаўшы план на два цэнтнеры. Удаўся лён добры. Добрасумленна, уважліва апрацоўвалі яго калгасніцы. Брыгады працавалі дзень і ноч, спаборнічаючы паміж сабой.

У падарунак да XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б) дэлегаты калгаса „Колас" прывезлі на канферэнцыю цэнтнер добраякаснага ільнавалакна.

Многа зроблена па культпаходу. Пабялілі хаты, ацяплілі канюшні, хлявы, але шмат чаго яшчэ не дагледжана.

Сярод дэлегатаў—11-гадовая піонерка Маня Гурыновіч, якая ў час культпахода разам з брыгадай вучняў правярала культурна-бытавое становішча ў калгасе. Яна ўмешваецца ў гутарку.

— Вы кажыце, што каровы ў добрым становішчы—гэта не зусім так. А ўмывальнікі і ручнікі ў кароўніку ёсць, каб даяркі маглі мыць рукі перад даеннем?—Няма.

— Што-ж вы яшчэ абследвалі?—пытаемся мы ў Мані Гурыновіч.

— Агледзілі мы насенне ў свірне. Яно не добра было ачышчана. Мы паставілі пытанне на праўленні калгаса і старшыня даў загад прапусціць яшчэ раз праз трыер,—з гонарам заявіла Маня.

— Хадзілі мы па хатах. Самая чыстая хата ў тав. Швайкі. Самая брудная—у Гурыновіча Цімоха. Наша брыгада даказвала шкоднасць бруда, але Цімох цяжка паддаецца агітацыі.

* * *

Канферэнцыя прайшла пад лозунгам—культурна працаваць і культурна жыць. Поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ў жорсткай барацьбе з класавым ворагам, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў і на гэтай аснове заможнае жыццё калгаснікаў—стварылі ўсе ўмовы для культурнага жыцця ў калгасе.

У сваім дакладзе начальнік палітаддзела тав. Бангайціс адзначыў, што па Слуцкаму раёну колектывізавана 62 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а па зоне дзейнасці МТС—67 проц. Калгасам адведзена лепшая зямля, якая раней належыла кулакам.

З 1931 па 1933 год колькасць буйнай рагатай жывёлы выросла з 21 тысячы да 23 000 галоў.

Дзякуючы кіраўніцтву палітаддзела мы маем лепшую апрацоўку глебы, павышэнне ўраджайнасці палёў, багаты працадзень, які павялічыўся супроць мінулага году ў два—тры разы.

У гэтым годзе калгасы лепш справіліся са здачай сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве. Поўнасцю засыпаны насенныя фонды. Многія калгасы ўжо адрамантавалі інвентар і сельскагаспадарчыя машыны.

Пад кіраўніцтвам палітаддзела адсталыя калгасы пачынаюць наладжваць сваю работу. Напрыклад, у калгасе „Ботвін", дзе раней арудвалі кулацкія элементы, у мінулым годзе на працадзень атрымоўвалі ўсяго 400 грам хлеба, а ў гэтым годзе, дзякуючы новаму кіраўніцтву, па—2½ *кг* збожжавых, 5 *кг* бульбы і іншых прадуктаў. Калгас пабудаваў дом соцкультуры, хату-чытальню, арганізоўваецца культурны догляд жывёлы.

У 40 калгасах (з 55) працуюць агратэхгурткі. Працуюць арганізаваныя палітаддзелам курсы конюхаў, брыгадзіраў, трактарыстаў, старшынь калгасаў і сакратароў калгасных ячэяк.

У калгасах „Правда", „Вольная праца", „Хваля рэволюцыі", „Ботвін", „Першае мая", „Чырвоны маяк № 2" і інш. арганізаваны дамы соцкультуры. Дамы ўтульна абсталяваны, у іх ёсць радыё, шашкі, шахматы і доміно.

Вельмі цікавыя прыклады заможнага і культурнага жыцця асобных калгаснікаў.

Зузім змянілася жыццё калгаснікаў.

Макарэнка Хрысціна з калгаса „Новае жыццё" была раней батрачкай. Нічога, акрамя сваіх рук, яна не мела, ды і тыя заўсёды працавалі на кулака. Зараз т. Макарэнка выпрацавала 206 працадзён, атрымала 35 пудоў збожжа, 95 пудоў бульбы і жыве добра. Макарэнка была раней зусім непісьменнай. У калгасе яна ліквідавала сваю непісьменнасць і зараз вучыцца ў вячэрняй школе калгаснай моладзі. Такіх прыкладаў многа.

Тав. Бангайціс завастрыў увагу канферэнцыі на недахопах. План здачы ільнавалакна выканан толькі на 82 проц. Некаторыя калгасы не спраўляюцца з апрацоўкай ільна. Яшчэ засталося 28 бескароўных, якіх трэба надзяліць цёлкамі. Усе гэтыя недахопы павінны быць ліквідаваны да XV з'езда КП(б)Б.

Таварышы, якія выступалі ў спрэчках, падзяліліся вопытам работы па выкананні лозунга:—культурна працаваць, культурна жыць.

Калгас „Новае жыццё" з'яўляецца перадавым па ўкараненні агразоатэхвучобы. Праўленне паставіла задачу—кожны калгаснік, павінен набыць агразоатэхнічныя веды. У агразоатэхгурткі ўцягнута многа жанчын.

Калгас паставіў перад сабой задачу—павысіць ураджайнасць, зняць з *га* не менш тысячы пудоў бульбы. Ужо ў 1933 годзе знялі 900 пудоў з *га*.

У калгасе „Вольная праца" арганізаван культурны догляд жывёлы. У аборы суха і цёпла. Даяркі атрымоўваюць працадні ад велічыні ўдоя. У калгасе арганізавана школа малапісьменных.

У заключэнне канферэнцыя паслала ліст рабочым Маскоўскага аўтазавода імя Сталіна, які датэрмінова выканаў план 1933 года. У лісце калгаснікі дзеляцца сваімі дасягненнямі, побач з чым адзначаюць, што паводле ўзятых абавязацельстваў калгасы зоны дзейнасці Слуцкай МТС павінны былі адкарміць 50 кабаноў для перадавога завода Масквы, які датэрмінова выканае план 1933 г. І вось свой падарунак калгаснікі зараз перадаюць Маскоўскаму аўтазаводу імя Сталіна.

Алена

Слуцк.

Калгасніцы—ударніцы! Пішыце аб вашым удзеле ў культпаходзе імя XVII з'езда ВКП(б).

Пачалося зусім новае жыццё

Інтэрнацыянальны калгас „Першае мая“ арганізаваўся яшчэ ў 1925 годзе з 9 гаспадарак. Раней гэта быў эканамічна зусім слабы калгас і наогул адзін з адсталых у раёне.

Шкодніцкае кіраўніцтва, класавыя ворагі прывялі калгас у 1931 годзе амаль да развала. Амаль усё на полі пагніло. Шкоднікі былі выкрыты і пакараны пролетарскім судом. Калгас быў ачышчан ад кулацкіх элементаў. Пад кіраўніцтвам палітаддзела новае праўленне калгаса пачало наладжваць работу.

Зараз калгас вышаў з адсталых у адзін з перадавых у раёне. У калгасе 170 двароў. Ураджайнасць у параўнанні з 1931 годам павысілася ў 5 разоў. Калі ў 1931 годзе калгаснікі атрымалі на працадзень 465 грам збожжавых, то ў 1933 годзе атрымаюць у сярэднім на працадзень апрача 3 руб. грашыма па 2 кгр. 600 грам збожжавых, па 8 кгр. бульбы, 5 кгр. кораньплодаў.

Я выпрацавала 250 працадзён. Атрымала многа сельска-гаспадарчых прадуктаў і грошай. Вось і стала жыць у дастаўку. Ніколі раней я не магла марыць аб такім жыцці. Да ўступлення ў калгас у мяне ніякай маемасці не было, а зараз я маю цёлку і кабана. Хадзіла раней босай, а цяпер набыла 4 пары новых чаравік, шоўкавае плацце, некалькі шарсцяных, купіла паліто, якое каштуе больш за 300 руб. Усё гэта я маю дзякуючы ўдарнай рабоце і добрасумленным адносінам да калгаснай маемасці.

Наш калгас выканаў перад дзяржавай усе абавязкі па здачы сельска-гаспадарчых прадуктаў. Мы выканалі ўсе абавязацельствы, узятыя да партыйных з'ездаў. Калгас ужо гатоў да вясны. Поўнасцю засыпалі высокаякасным збожжам насеныя фонды, якія захоўваюцца ў лепшым свірне. Яшчэ засталося прапусціць насенне праз трыер. Адрамантавалі ўвесь сельска-гаспадарчы інвентар і машыны. Мяркуем у хуткім часе зрабіць пробны выезд у поле.

Жывёла ў нас знаходзіцца ў добрых умовах, у ацепленых, з жалезнымі печамі хлявох. У кароўніку праведзена электрычнае святло.

У сувязі з нашымі гаспадарчымі поспехамі выраслі нашы культурныя запатрабаванні. Мы пабудавалі дом соцкультуры, арганізавалі палітгурток, у якім навучаецца 35 калгаснікаў. У сувязі з культпаходам мы правялі рэйд па агляду чыстаты хат калгаснікаў.

Нашы калгаснікі падпісаліся на пазыку больш, чым на 12.000 руб., што складае больш 100 проц. задання. Мы разгарнулі падпіску на журнал „Работніца і калгасніца Беларусі“ і завербавалі 50 гадавых падпішчыц.

Наш калгас лічыцца адным з лепшым у раёне, ён залічан палітаддзелам МТС у кандыдаты на атрыманне пераходнага сцяга палітаддзела.

Зараз перад намі стаіць задача—арганізаваць агразоатэхвучобу, уцягнуць у яе як мага больш жанчын. Трэба будзе смялей вылучаць калгасніц—лепшых ударніц на адказную гаспадарчую работу.

Калгасніца Бася Перкаль.
Слуцк.

Навучыліся культурна працаваць і культурна жыць

Прыехалі мы з дэлегацыяй Рагачоўскага раёна на культбытавую канферэнцыю калгасаў зоны дзейнасці Слуцкай МТС, каб падзяліцца вопытам работы нашых калгасаў у барацьбе за здаровы быт, за культурнае жыццё.

Наш калгас імя Сталіна датэрмінова выканаў свае абавязкі перад дзяржавай. Лён здалі высокай якасці. Поўнасцю засыпаны насенныя, страхавыя і ясельныя фонды.

Мы ажыццявілі пастанову партыі і ўрада аб дапамозе бескароўным. Усе калгаснікі да аднаго забяспечаны добрымі цёлкамі.

Змагаемся за культурны догляд жывёлы. Каровы ў нас стаяць у чыстых, ацепленых хлявох. Перад дойкай даяркі мыюць рукі.

Мы маем многа дасягненняў у галіне культурнага будаўніцтва. Пабудавалі клуб, арганізавалі чырвоны куток, заканчваецца пабудова новай лазні.

Нашы калгасніцы зразумелі, што трэба культурна працаваць і культурна жыць, некаторыя актывісткі наведваюць партвучобу, дзесяць жанчын займаюцца ў школе малапісьменных.

Уключыўшыся ў культпаход імя XVII партз'езда, калгасніцы малочнай фермы абавязаліся дабіцца высокага ўдоя, лепш гадаваць маладняк, каб не было адыхода.

Мы разгарнулі соцспаборніцтва паміж калгаснікамі на лепшую і чыстую кватэру, выклікалі на спаборніцтва суседні калгас імя Калініна.

Але ў нас ёсць і недахопы. Лозунг тав. Сталіна аб тым, што жанчына ў калгасе—вялікая сіла і што трэба гэту сілу пусціць у справу—не выконваецца ў нашым калгасе. На адказных гаспадарчых пасадах няма жанчын—вылучэнак.

Калгасніца Марыя Мартынава.

Газету выпісваюць і чытаюць усе

У барацьбе за культурнае жыццё калгаснікі калгаса „Полымя“ (Рагачоўскі раён) дабіліся значных дасягненняў. У калгасе абсталяван ленінскі куток, для якога закуплена бібліятэчка на 200 руб.

У хуткім часе будзе ўстаноўлен у ленкутку радыёпрыёмнік. Таксама радыёпрыёмнікі будуць устаноўлены і ў калгасных хатах. Распачынаецца будаўніцва культурнай калгаснай лазні, якая разлічана на 30—40 чалавек.

Дадзен заказ каапэрацыі на набыццё для калгаснікаў 6 нікеліраваных ложкаў, шаф, а таксама на розныя пасцельныя рэчы.

У калгасе створана культурнабытавая камісія, якая правяла агляд калгасных хат і двароў, у выніку чаго амаль усе хаты калгаснікаў пабелены, або выклеены шпалерамі, дзверы чыстыя.

У калгасе няма ніводнай калгасніцы і калгасніка, які-б не выпісваў і не чытаў газет.

Я. Гаварушка.

ПАСПЯХОВАЯ РАБОТА ДЗІЦЯЧЫХ УСТАНОЎ—ЗАРУКА ЎДАРНАЙ ПРАЦЫ КАЛГАСНІЦ

Нашы дасягненні, недахопы і задачы

У Дзяржынскім раёне ў гэтым годзе працавала 105 дзіцячых устаноў (ясляў і пляцовак), з іх 10 у совгасах і 95 у калгасах. У 1932 годзе па калгасах і совгасах раёна працавала ўсяго 40 дзіцячых устаноў.

У шматлікіх яслях і пляцоўках работа была пастаўлена узорна. Напрыклад, у калгасе „Профінтэрн", Сталінскага сельсовета, у калгасе „Праца", Негарэльскага сельсовета і іншых.

Безумоўна, што такое разгортванне сеткі дзіцячых устаноў і ўзорная пастаноука іх работы спрыялі ўцягненню калгасніц у вытворчую работу.

Не мала маем мы калгасніц-ударніц, якія добрасумленна ўдзельнічалі ў барацьбе за выкананне лозунга правадыра партыі тав. Сталіна — зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі. Вынікі гэтай ударнай працы ўжо адчуваюцца селета.

Былая батрачка Торба, якая заўседы ў сваім жыцці адчувала недахоп хлеба і неабходнейшых рэчаў, а зараз калгасніца калгаса „Перамога", Негарэльскага сельсовета, сапрауды ўбачыла светлае жыццё. Яе сям'я, у якой ёсць 3 працаздольныя і два ўтрыманцы, будзе мець сёлета 200 пудоў збожжа і шмат бульбы.

У іх калгасе на працадзень прыпадае па 13 фунтаў збожжавых і па 15 фунтаў бульбы.

У мінулым годзе сям'я Торбы атрымала 150 пудоў збожжа. Акрамя таго, што на гэта збожжа было накуплена шмат новай вопраткі, толькі нядаўна скончылі есці мінулагодні хлеб.

У гэтым г дзе калгасніца Торба збіраецца набыць добрую меблю, каб хата мела культурны выгляд.

Калгасніца **Шамко** з калгаса „Трыбуна Радзецка" кажа, што ніколі ў жыцці не мела столькі збожжа, колькі яна атрымае сёлета, ды яшчэ і новую вопратку, і абутак, і нават выходную шоўкавую сукенку, якія яна купіла нядаўна.

Дзіцячыя ўстановы адыгрываюць вялікую ролю ў справе ўцягнення калгасніц у актыўнае калгаснае будаўніцтва. Аднак гэтага не зразумелі яшчэ рад старшынь сельсоветаў і калгасаў.

Так, старшыні Дабрынеўскага, Старынкаўскага і Новасадскага сельсоветаў адмовіліся выдаць для дзіцячых устаноў грошы, якія былі ім адпушчаны. Прэзідыум РВК вынес ім вымову за нескарыстанне сродкаў для гэтай мэты.

А старшыні калгасаў, „Зара", Байдацкага сельсовета, і „Чырвоны кастрычнік", Паланееўскага сельсовета, не знайшлі патрэбным забяспечыць яслі добрым памяшканнем, у той час, як у калгасе ёсць вольныя добрыя хаты.

Вялікай перашкодай у рабоце з'яўлялася адсутнасць належных падрыхтаваных кадраў. Вінаваты ў гэтым самі калгасы і ў першую чаргу калгасніцы. На курсы загадчыц некаторыя калгасы не прыслалі людзей, а некаторыя прыслалі такіх, якія не апраўдалі сябе на іншай калгаснай рабоце. Для работы ў яслях пасылалі старых жанчын інвалідаў, якія не здольны працаваць на другіх работах. У калгасе „Чырвоны пагранічнік", Бароўскага сельсовета, пасылалі працаваць у яслі па чарзе на 2 тыдні, або на месяц, як у калгасе „Чырвоны сцяг", Байдацкага сельсовета. Безумоўна, пры такой пастаноўцы работы дзеці не маглі мець належнага выхавання і догляда.

Мы паставілі сабе мэтай, каб у будучым годзе ў кожным калгасе былі яслі, або яслі і пляцоўка. Для гэтага неабходна сваечасова паклапаціцца аб вызначэнні харчовых фондаў для ясляў. Задача ўсяго актыва калгасніц—своечасова разгарнуць масавую работу вакол гэтага пытання.

Трэба зараз ужо пачаць рыхтаваць найбольш падыходзячыя памяшканні для ясляў і пляцовак.

Неабходна на ясельныя і дашкольныя курсы, якія хутка пачнуць працаваць у нашым раёне, паслаць лепшых ударніц, якім можна будзе даверыць комуністычнае выхаванне малодога пакалення.

Жанорг РК КП(б)Б
Шыцькоўская.

Дзяржынскі раён.

Кіраваць яслямі так, як т. Рудзіна

У калгасе „Прабуджаны агароднік" вельмі добра працавалі дзіцячыя яслі, якімі былі ахоплены ўсе дзеці калгаснікаў, што вызваліла жанчын для вытворчай працы ў калгасе.

Загадчыца яслямі Рудзіна, якая скончыла курсы па ахове мацярынства і дзяцінства, вельмі добра наладзіла догляд за дзецьмі: у памяшканні ўзорная чыстата, добрае харчаванне дзяцей, сістэматычны нагляд доктара. Таксама вельмі добра наладжана выхаваўчая работа сярод дзяцей і матак. Дзеці ў гульнях прызвычайваліся да працы—арганізоўваліся экскурсіі, лепка, пабудова градак, агарода, кветніка. Часта дзецям паказвалі дзіцячае кіно.



т. Рудзіна.

З маткамі праводзіліся гутаркі і чыткі.

Зараз калгас клапоціцца, каб яшчэ лепш абсталяваць памяшканне для ясляў, лепш замацаваць іх на зіму, стварыць харчовы фонд і падрыхтаваць добрых памочніц тав. Рудзінай.

Яслі, кіруемыя тав. Рудзінай з'яўляюцца вузорам таго як па трэбна паставіць выхаванне дзяцей, каб яны выраслі сапраўды большэвіцкай зменай.

Прыклад работы тав. Рудзінай варты таго, каб яго пераймать, каб у яе вучыцца.

Жано.

Менскі раён.

Ажыццяўляюцца запаветы Леніна

„Сапраўднае вызваленне жанчыны, сапраўдны комунізм пачынаецца толькі там і тады, дзе і калі пачынаецца масавая барацьба, кіруемая пролетарыятам, які ўладае дзяржаўнай уладай, супроць гэтай дробнай хатняй гаспадаркі, або праўдзівей — масавая перабудова яе ў буйную соцыялістычную гаспадарку" (ЛЕНІН).



Сталоўка.



У яслях Менскай швейнай фабрыкі „Окцябр".

Па БССР зараз ахоплена дзіцячымі яслямі 9.000 дзяцей работніц, а дзіцячымі пляцоўкамі 32.500.

У калгасах у 1933 годзе працавала 4940 ясляў, з ахопам 124.000 дзяцей і 3.334 пляцоўкі з ахопам 98.536 дзяцей



Палата нованароджаных раддзільнага дома клінічнага гарадка ў Менску.

У яслях Менскай абутковай фабрыкі імя Кагановіча.

Кошт асобнага нумара 10 кап.

85

1964 г.

У час падрыхтоўкі да партыйных з'ездаў новыя рэзервы працоўных жанчын уключаюцца ў актыўную работу

Жонкі рабочых Асінторфа ўключыліся ў вытворчы паход імя XVII партз'езда.

На агульным сходзе жонкі рабочых абавязаліся да XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б) наладзіць работу ясляў, дзіцячага сада, выявіць і знішчыць недахопы ў рабоце сталовак, бальніцы, кааперацыі, лазні, палепшыць жыллёвыя ўмовы тарфяніц і сезонных рабочых.

На заўтра-ж пасля схода брыгады з жонак рабочых рассыпаліся па пасёлках. У бальніцы, побач з фактамі добрай работы, брыгады выкрылі, што дэзынфекцыйная камера валяецца ўжо доўгі час на дварэ без усякай карысці. Прараб Беленькі ігнаруе загад аб пабудове будынка для дэзынфекцыйнай камеры. Гэты матэрыял брыгада перадала пракурору.

У бараках брыгады выявілі дрэнную падрыхтоўку да зімы. У бараку № 1 жывуць сямейныя работніцы з грудзьмі дзецьмі, а на вокнах няма двайных рам, у сценках ёсць шчыліны, баракі не забяспечаны апалам, пануе антысанітарыя. Брыгада гэты матэрыял перадала ў парткалектыў і тарфком для неадкладнага рэагавання.

У яслях — неправільны ўлік прадуктаў. Загадчыца — маладая работніца, без належнага вопыта работы. Тут брыгада арганізавала пастаянную дапамогу па наладжанні работы ясляў.

У рабоце сталоўкі пасёлка № 2 няма гібкасці. Рабочаму прыходзіцца доўга стаяць у чарзе за талонам, а потым чакаць падачы абеда, або снедання. На 400 чалавек ёсць усяго 20 місак. Павары без спецвопраткі.

Брыгада выклікала прадстаўніка ОРС'а (аддзела рабочага снабжэння). Аказалася, што міскі марынаваліся на складзе, а загадчык сталоўкі не паклапаціўся, каб іх прывезці. К вечару ўказаныя брыгадай недахопы былі ўжо знішчаны.

Брыгада таксама выявіла, што пральня не працуе. А ў бані, якая абслугоўвае 2000 чалавек, ёсць усяго 15 лаханак.

Выяўляючы ўсе недахопы і асвятляючы іх на старонках газеты „За торф", жонкі рабочых актыўна змагаюцца за знішчэнне іх.

Шырока разгарнуў работу швейны і рукадзельны гурток жонак рабочых. У першую чаргу члены гуртка абавязаліся пашыць бялізну і вопратку для ясляў і сада.

У швейным гуртку займаюцца 42 жонкі рабочых. Там-жа праводзяцца гутаркі па бягучай палітыцы і галосная чытка журнала „Работніца і калгасніца Беларусі". В. Драздоўская.

Асінторф.

УДАРНІЦЫ ВЫТВОРЧАСЦІ—УДАРНІЦЫ ВУЧОБЫ

Лепшыя ўдарніцы Асінторфа, якія ў час сезона выконвалі норму па штабелёўцы на 201—205 проц., з'яўляюцца зараз лепшымі ўдарніцамі вучобы.

Комсамолка БІКЕНІСАВА, вылучаная з пагрузчыц торфа на курсы дзесятнікаў, здае залікі па ўсіх дысцыплінах на „ВЕЛЬМІ ДОБРА". Не адстае і лепшая ўдарніца — слесар КУПЦОВА, якая вучыцца на курсах па павышэнню кваліфікацыі.

Тарфяніцы ФІЛОНАВА і ГАРОДНІКАВА, якія там таксама навучаюцца, абавязаліся к XVII партз'езду здаць прапрацаваны матар'ял на „вельмі добра".

В. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ.

Асінторф.

Уключыліся ў культпаход імя XVII з'езда ВКП(б)

Жонкі служачых мястэчка Узда ўключыліся ў культпаход імя XVII партз'езда.

На сходзе, дзе абмяркоўвалася гэта пытанне, былі абраны 4 брыгады для правядзення культурна-масавай работы ў бліжэйшых 4-х калгасах. Лепшыя актывісткі культпахода — т.т. Шпакоўская, Міснікевіч, Маняк, Калінічэнка, Ліўшыц і інш.

Арганізаван таксама паліггурток з жонак служачых.

На гэтым-жа сходзе ўсе жанчыны падпісаліся на свой журнал „Работніца і калгасніца Беларусі".

Узда. Шмыгіна.

З прыбіральшчыц—у кваліфікаваныя работніцы

Раней я ведала толькі мятлу. Кастрычніцкая рэволюцыя дапамагла мне стаць кваліфікаванай работніцай — зараз я працую на электразварцы. Работу сваю выконваю добра, норму перавыконваю. Шмат другіх работніц былі раней на нашым заводзе прыбіральшчыцамі — зараз яны кваліфікаваныя. Былая прыбіральшчыца Жырашэвіч, зараз таксама працуе на электразварцы. Кастрычніцкі план яна выканала датэрмінова на 160 проц.

Кожны дзень я дзіўлюся і захапляюся тым, як мяняе твар наша Совецкая Беларусь. І гэта не толькі ў нас, у Беларусі. Я ездзіла нядаўна ў госці да брата ў Бежыцу і не пазнала гэтага горада. Раней там было на вуліцах балота, былі не дамы, а старыя хібаркі. Зараз там выраслі вялікія, прыгожыя дамы, клубы, тэатры.

Увесь гэты рост натхняе мяне на яшчэ большую барацьбу за прамфінплан, за аўладанне тэхнікай, за якасць працы.

Работніца Белякоўская.

Завод імя Мяснікова (Менск).

ПАПРАЎКА

У № 35 журнала „Работніца і калгасніца Беларусі" на 12 старонцы, у заметцы: „Жонкі рабочых патрабуюць прыцягнення іх да работы ў вытворчасці"—па тэхнічным прычынам выпала назва завода „Большэвік".

Выданне ЦК КП(б)Б Адк. рэдактар Э. Шапіра

Адрас рэдакцыі: Менск. Совецкая, 68, 3-ці паверх, 11-ты пакой. Тэл. 22-415.

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 57 У ліку 16.400 экз. Менгарліт № 570

Здана ў набор 9-I—34 г. Падпісана да друку 17-I—34 г. У нумары 2½ арк., 103.980 друк. зн.